# Прэзентацыя кнігі "Паўстанчы дух"



12 верасня у Гарадзенскай абласной навуковай бібліятэцы імя Я.Ф. Карскага прайшла прэзентацыя кнігі Леаніда Лаўрэша "Паўстанчы дух. 1812, 1831, 1863 гады на Лідчыне" (Гродна, 2016. 244 с.).

Як адзначыў у прадмове да кнігі кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.Р. Радзюк, у апошнія два дзесяцігоддзі незалежнай гісторыі Беларусі зроблены спробы новай ацэнкі і інтэрпрэтацыі падзей 1812, 1831 і 1863 гадоў. Але нягледзячы на паступальны рух наперад у іх вывучэнні, па-ранейшаму застаецца шмат "белых плямаў". Адным са спосабаў іх ліквідацыі з'яўляецца распрацоўка рэгіянальнай гісторыі. Падобны падыход дазваляе нібыта праз павелічальнае шкло пабачыць тое, чаго звычайна не відаць у акадэмічных выданнях і працах прафесійных гісторыкаў. На месцы бывае прасцей разабрацца з нейкай праблемай, убачыць яе спецыфіку, чым з далёкіх кабінетаў. Менавіта такую функцыю выконваюць нарысы гісторыі барацьбы жыхароў Лідчыны за незалежнасць свайго краю лідскага даследчыка, якія нядаўна выйшлі з-пад выдавецкага варштата.

Прэзентацыя была арганізавана сумесна з факультэтам гісторыі, камунікацыі і турызму Гарадзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, чые выкладчыкі і студэнты ўдзельнічалі ў абмеркаванні кнігі. Прысутнічалі таксама гарадзенскія краязнаўцы. Супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі да прэзентацыі выставу апублікаваных работ Л. Лаўрэша.




Прэзентацыю распачала дырэктар бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага Мальцава Л.В. Вяла прэзентацыю прафесар, доктар гістарычных навук С.В. Марозава. Пра працу гарадзенскага выдавецтва "ЮрСаПрынт", у якім выйшла кніга, распавёў яго дырэктар



А. А. Рыжы. Пасля гэтага аўтар адказаў на шматлікія пытанні і расказаў пра свае творчыя планы: ужо ў выдавецтве знаходзіцца кніга пра Маламажэйкаўскую царкву, рыхтуецца вялікая кніга "Лідчына ў прэсе: 1906 - 1939 гг.".

**Даведка.**

*Леанід Лаўрэш (нарадзіўся ў 1963 г. у Лідзе, скончыў Беларускі політэхнічны інстытут) - беларускі краязнавец, даследчык гісторыі Лідчыны, аўтар 6 кніг і больш сотні артыкулаў, стваральнік гістарычна-краязнаўчага сайту pawet.net, пастаянны аўтар газеты "Наша слова", удзельнік шматлікіх навуковых канферэнцый. Сфера навуковых зацікаўленняў - краязнаўства і гісторыя прыродазнаўчых навук на Беларусі. Сваімі даследаваннямі Л. Лаўрэш робіць значны ўклад у пашырэнне ведаў пра гісторыю Лідчыны, пазнанню яе месца і значнасці ў еўрапейскім гістарычным кантэксце.*

***Наш кар.***